Partnership for Good Governance

COUNCIL OF EUROPE

EUROPEAN UNION

CONSEIL DE L'EUROPE

**ПАВЕДАМЛЕННЕ ДЛЯ СМІ: Савет Еўропы і Еўрапейскі Саюз прадставяць вынікі праектаў для Беларусі**

Страсбург / Мінск, 3 лістапада 2017 года - У чацвер, 9 лістапада, Савет Еўропы і Еўрапейскі Саюз прадставяць у Мінску вынікі праектаў для краін Усходняга партнёрства, уключаючы Беларусь.

Тры спецыфічныя для краін праекты, якія ажыццяўляюцца ў Беларусі ў рамках Партнёрства дзеля належнага кіравання[1] на працягу 2015-2017 гадоў, фінансуюцца ЕС і Саветам Еўропы і выконваюцца, у прыватнасці, Саветам Еўропы. Іх **агульны бюджэт складае 200 000 еўра.**

Праекты былі накіраваныя на прасоўванне стандартаў Еўрапейскай хартыі рэгіянальных моў або моў меншасцяў у Беларусі, а таксама ў падтрымку правоў чалавека, належнага кіравання і барацьбы з карупцыяй.

Апроч гэтых трох спецыфічных для краін праектаў Беларусь таксама прымае ўдзел у 14 рэгіянальных мерапрыемствах, якія ахопліваюць усе краіны Усходняга партнёрства.

**Фрэдэрык Коэн**, кіраўнік аддзела супрацоўніцтва, Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі; **Андрэй Бушыла**, Кіраўнік Дэпартамента еўрапейскага супрацоўніцтва Міністэрства замежных спраў Беларусі; і **Аркадзь Сыцін**, Каардынатар службаў ЕС/Савета Еўропы, выступяць перад удзельнікамі.

Першая частка мерапрыемства, падчас якой будуць прадстаўлены вынікі праекта, адкрыта для СМІ **з 14:30 да 15:15, у чацвер, 9 лістапада,** у «Crowne Plaza Minsk», вул. Кірава 13 220030, Мінск, Беларусь. Мовы: англійская, руская. Журналісты змогуць задаць пытанні выступоўцам падчас перапынку.

***Дадатковая інфармацыя:***

*Для атрымання дадатковай інфармацыі:* http://eap-pcf-eu.coe.int/belarus

**Звязацца:** Таццяна Баева, Tatiana.baeva@coe.int, +33 685 11 64 93.

[1] Раней называлася праграмай супрацоўніцтва для краін Усходняга партнёрства